ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 31 (631) | Субота, 22 лістапада 1986 годаў | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## КАРЫФЕЙ НАВУКІ

Нязгаснай зоркай гарыць на небасхіле айчыннай навукі і культуры імя Ламаносава. Выдатны вучоны-энцыклапедыст, нястомны асветнік і гарачы патрыёт сваёй краіны, ён надаў развіццю нашай Радзімы дынамізм, стаў для нас сімвалам сувязі навукі і практыкі, чалавекам, які ўвасобіў у сабе магутную сілу народа.

275-годдзю з дня нараджэння карыфея рускай і сусветнай навукі было прысвечана ўрачыстае пасяджэнне, якое адбылося 19 лістапада ў Маскве, у Вялікім тэатры Саюза ССР.

Урачысты сход адкрыў прэзідэнт Акадэміі навук СССР акадэмік Г. І. Марчук. Шматгранная дзейнасць заснавальніка айчыннай навукі, сказаў ён, была самым цесным чынам звязана з жыццёвымі патрэбнасцямі рускай дзяржавы. М. В. Ламаносаў нястомна змагаўся за выхад айчыннай навукі на перадавыя пазіцыі — у грамадазнаўчых навуках і тэхніцы, гісторыі і філасофіі, літаратуразнаўстве і навуках аб Зямлі.

На працягу многіх гадоў жыццё і навуковая творчасць Ламаносава былі непадзельна звязаны з Акадэміяй навук.

З дакладам «М. В. Ламаносаў — заснавальнік айчыннай навукі» выступіў віцэ-прэзідэнт АН СССР акадэмік К. В. Фралоў. Ён падрабязна спыніўся на гадах вучобы Ламаносава, адзначыўшы, што незвычайныя здольнасці і працавітасць далі магчымасць дапытліваму юнаку хутка рухацца наперад у вывучэнні навук.

Першы сакратар Архангельскага абкома КПСС П. М. Целяпнёў з вялікім задавальненнем паведаміў аб тым, што не зарастае народная сцежка на радзіму нашага выдатнага земляка. Вядомыя прадстаўнікі савецкай навукі лічаць гонарам прыехаць у Архангельск на штогадовыя ламаносаўскія чытанні, зрабіць справаздачу аб сваіх працах перад землякамі вялікага вучонага. Няхай жа ўмацоўваюцца і далей ламаносаўскія традыцыі нашай навукі — традыцыі смелай наватарскай думкі, нястомнай творчасці і вернасці народу.

Аб М. В. Ламаносаве — стваральніку рускай літаратурнай мовы і рускай паэзіі — гаварыў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР А. А. Міхайлаў.

У заключэнне ўдзельнікам урачыстага пасяджэння была паказана опера М. Мусаргскага «Барыс Гадуноў».

(ТАСС).

## САСТАЎ ПРАФКОМА СТУДЭНТАЎ

Н. АГЕЕВА — студэнтка 3-га курса матэматычнага факультэта.
Я. БЕЛАШ — студэнт 3-га курса эканамічнага факультэта.
І. БІДНЮК — студэнт 3-га курса факультэта фізвыхавання.
В. ВЕЛІКАБОРАЦ — студэнт 2-га курса факультэта фізвыхавання.
А .ГУРЫК — студэнт 2-га курса фізічнага факультэта.
В. ДАШКЕВІЧ — студэнтка 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
І. ДЗІДКОЎСКІ — студэнт 3-га курса біялагічнага факультэта.
М. ДЗМІТРУК — студэнтка 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
Л .ЖУК — студэнтка 2-га курса матэматычнага факультэта.
А. ЗАКРУЖНАЯ — студэнтка 1-га курса біялагічнага факультэта.
М. ЗІНОВЕНКА — студэнт 3-га курса геалагічнага факультэта.
І. ІСАЕНКА — студэнт 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
С. КАЧАЛОЎСКАЯ — студэнтка 2-га курса эканамічнага факультэта.
С. КЛЕКЕЛЬ — студэнтка 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
М. КЛЯЦКО — студэнт 2-га курса эканамічнага факультэта.
Н. КОЛТЫШАВА — старшыня прафкома.
В. КАСЦЮЧЭНКА — студэнт 3-га курса геалагічнага факультэта.
А. КРУПСКАЯ — студэнтка 3-га курса матэматычнага факультэта.
Т. ЛІСТАПАД — студэнтка 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
А. ЛАПАЦЕНКА — студэнтка 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
У. МАЛЧАНАЎ — студэнт 2-га курса фізічнага факультэта.
П. ПЯТРОЎСКІ — студэнт 3-га курса эканамічнага факультэта.
В. РАБІКАВА — студэнтка 1-га курса эканамічнага факультэта.
В .СЕНІНА — намеснік старшыні прафкома.
Г. СТАРАВОЙТАВА — студэнтка 3-га курса матэматычнага факультэта.
Н. СТРЫЖНЕВА — студэнтка 2-га курса фізічнага факультэта.
В. СЫЧОВА — студэнтка 2-га эканамічнага факультэта.
В. ТРУШКО — студэнт 1-га курса факультэта фізвыхавання.
А. ХАРОШЧА — студэнтка 1-га курса фізічнага факультэта.
А .ШЭВЕЛЕВА — студэнтка 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.
С. ЮДЗЯНКОЎ — студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факукьтэта.

*УДАСТОЕНЫ ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ*

## ФОРМУЛА ЖЫЦЦЯ



З'яднанасць калектыву, яго працаздольнасць у значнай ступені залежаць ад кожнага работніка, але ў найбольшай ступені — ад кіраўніка. Гэта асабліва востра адчуваецца там, дзе такой маналітнасці няма. Што датычыць матэматычнага факультэта, то ён уяўляе сабой сапраўды працалюбівы калектыў. У гэтым вялікая заслуга яго дэкана дацэнта У. Ф. Філіпцова.

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце Уладзімір Фёдаравіч працуе з першага года яго ўтварэння. У той час на матэматычным факультэце было толькі чатыры кафедры. На адну з іх — матэматычнага аналізу — на пасаду асістэнта быў выбраны У. Ф. Філіпцоў. За кароткі час ён зарэкамендаваў сябе з найлепшага боку як педагог і актывіст. На кожных занятках імкнецца даць максімум ведаў студэнтам. І не проста даць, а прыпаднесці іх так, каб укласці у свядомасць кожнага будучага спецыяліста.

Уладзімір Фёдаравіч валодае нейкім асаблівым падыходам да студэнцкай моладзі. Ён строгі і дабрадушны, сур'ёзны і жартаўлівы. Але ні ў адным выпадку не пераступіць мяжу дазволенага, не адступіцца ад педагагічнага такту. Яму ўласціва непрыкметная, але вельмі прыцягальная сіла. Без боязі да яго звяртаюцца па любому пытанню. І студэнты, і выкладчыкі ведаюць: Уладзімір Фёдаравіч пры неабходнасці падтрымае, па шчыраму дасць добрую параду. А калі чалавек у чымсьці адступіўся, дык ні ў якім разе не пойдзе на кампраміс, праявіць свой характар, да вінаватага аднясецца з поўнай мерай патрабавальнасці.

Дэканам факультэта У. Ф. Філіпцоў працуе адзінаццаць гадоў. За гэты час яму давodзілася вырашаць самыя разнастайныя пытанні. Адной з важнейшых была праблема кадраў. Было вырашана адмовіцца ад запрашэння на факультэт іншагародніх спецыялістаў. Вырашылі рыхтаваць іх праз аспірантуру з ліку лепшых выпускнікоў матфака. Цяпер на кафедрах працуе 17 сваіх выхаванцаў. Многія з іх сталі кандыдатамі фізіка-матэматычных навук.

Уменне працаваць з людзьмі прыйшло да Уладзіміра Фёдаравіча не адразу, набывалася з гадамі. І калі быў радавым настаўнікам, і калі працаваў дырэктарам сельскай школы. Ніколі не спыняйся на дасягнутым — гэта стала жыццёвым правілам Уладзіміра Фёдаравіча. І ён увесь час імкнецца да ўдасканальвання. У маладыя гады завочна закончыў Белдзяржуніверсітэт, затым стацыянарна — аспірантуру. Ужо працуючы ў нашым універсітэце, паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Цяпер У. Ф. Філіпцоў мае вялікі жыццёвы і педагагічны вопыт, які ненавязліва перадае іншым. Гэта адна з рыс, за якую нельга не любіць і не паважаць чалавека. Студэнты факультэта з задавальненнем пішуць пад кіраўніцтвам Уладзіміра Фёдаравіча курсавыя і дыпломныя работы, праводзяць навуковыя даследаванні. Вынік — высокія ацэнкі ў залікоўках і на рэспубліканскіх аглядах-конкурсах студэнцкіх навуковых прац.

Ва Уладзіміра Фёдаравіча, як і ў кожнага дэкана, штодзень шмат клопатаў. Нягледзячы на гэта, ён знаходзіць час і для добрасумленнага выканання грамадскіх абавязкаў, якіх у яго таксама нямала.

Калектыў нашага факультэта з вялікім задавальненнем сустрэў вестку аб узнагароджанні У. Ф. Філіпцова ордэнам Дружбы народаў, успрыняў яе як узнагароду ўсяму калектыву ў цэлым. На чале з Уладзімірам Фёдаравічам мы гатовы весці вялікую работу ў справе перабудовы вышэйшай школы.

**У. МІРОНЕНКА,**
**загадчык кафедры дыфураўненняў,**
**дацэнт.**
**Фота Л. Акінчыц.**

## «ІМПУЛЬС» — ПЕРАМОЖЦА АБЛАСНОГА АГЛЯДУ

**Калегія камітэта аблаграпрома, Прэзідыум абпсаўпрофа і бюро абкома ЛКСМБ разгледзелі вынікі абласнога агляду студэнцкіх атрадаў, якія працавалі сёлета на ўборцы бульбы, ільну, садавіны і гародніны.**

**Па групе вышэйшых навучальных установ першынство прысуджана атраду «Імпульс» (камандзір У. М. Карака, камісар І. А. Меланіч) фізічнага факультэта нашага універсітэта, які працаваў у калгасе імя XX партз'езда Жыткавіцкага раёна. Атрадам убрана 580 тон бульбы. Сярэднедзённая заработная плата кожнага члена атрада склала 7,39 руб., выкананне нормы выпрацоўкі—190,56%.**

**Атрад «Імпульс» узнагароджаны Ганаровай граматай абкома камсамола з выдачай грашовай прэміі 1500 рублёў.**

**Горача віншуем пераможцаў абласнога агляду з выдатнай працоўнай перамогай!**

## ДЗЕЛАВАЯ СУСТРЭЧА

Гэтымі днямі наш універсітэт наведаў намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР У. І. Крыцкі.

Адбылася сустрэча ў рэктарацe. Рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць расказаў пра вядучую вышэйшую навучальную ўстанову Беларускага Палесся, перспектывах яе развіцця. Асаблівая ўвага была звернута на далейшую актывізацыю навуковых даследаванняў, звязаных з сацыяльна-эканамічнымі планамі г. Гомеля, вобласці, рэспублікі. У ходзе сустрэчы гаворка ішла таксама аб тым, што ўжо зроблена ў ГДУ і што намячаецца ажыццявіць у адпаведнасці з вызначанымі партыяй асноўнымі напрамкамі перабудовы вышэйшай школы.

У. І. Крыцкі азнаёміўся з некаторымі факультэтамі і навукова-даследчымі лабараторыямі нашага універсітэта.

**(Наш кар.)**

Иван ХАРЛАМОВ.

# ОСЕНЬ

Опечалясь криком
журавлиным,
Лето
За околицу ушло,
Где, зардевшись
Отсветом рябинным,
Тает,
Закружась листвой,
Тепло...
Где туманы
Призраком белесым
По утрам
Клубятся за селом,
Где плывут,
Насупясь,
Из-за леса
Тучи,
Моросящие дождем.
Где, собрав
Богатый дар
Колосьев,
Щедрость расточая,
Как всегда,
Осень хлебосольная
Приносит
Радость урожая
И труда.

АДУКАЦЫЯ ЗА РУБЯЖОМ

# УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Л. ЭТВЕША

**У пачатку бягучага навучальнага года загадчык кафедры матэматычнага аналізу І. М. Бруй праходзіў павышэнне кваліфікацыі ў Венгерскай Народнай Рэспубліцы. Тут ён выступаў з лекцыямі, абменьваўся вопытам работы.**

**Прапануем увазе чытачоў першую карэспандэнцыю І. М. Бруя аб агульнаадукацыйнай і вышэйшай школе ў ВНР.**

Універсітэт імя Лараіда Этвеша быў заснаваны ў 1635 годзе. Летась ён адзначыў сваё 350-годдзе. Комплексы будынкаў універсітэта размешчаны ў чатырох месцах Будапешта. Таму адміністрацыйна ён падзелены на 4 факультэты: юрыдычны, гісторыка-філалагічны, прыродазнаўчых навук, педагагічны (рыхтуе настаўнікаў асноўнай васьмігадовай школы).

Для азнаямлення прыводзім структуру універсітэта.

Сярод выкладчыкаў універсітэта 42 сапраўдныя члены Венгерскай Акадэміі навук, 136 дактароў навук і 324 кандыдаты навук. Студэнцкае папаўненне для універсітэта рыхтуюць тры базавыя асноўныя 8-гадовыя школы і 4-гадовыя гімназіі: 1. Імя Андрэ Шагвары (адпаведна 63 настаўнікі і 683 вучні); 2. Імя Міклаша Радноці (96 і 1046); 3. Імя Янаша Апацаі-Чэрэ (58 і 562). Папаўненне дае таксама адладжаная сістэма алімпіяд.

Я быў прыкамандзіраваны к дэпартаменту аналізу Матэматычнага інстытута названага вышэй універсітэта. Варта мець на ўвазе, што ў гэтым універсітэце два Матэматычныя інстытуты. Навукова-даследчы Матэматычны інстытут узначальвае сапраўдны член Венгерскай Акадэміі навук Андрэш Хайнал. Я працаваў разам з ім. Матэматычны інстытут, як аб'яднанне матэматычных кафедр універсітэта ўзначальвае сапраўдны член ВАН Акаш Часар. Мне давялося пагутарыць з ім.

Пасля трох гадоў вучобы ва універсітэце студэнты, па словах прафесара Ферэнца Шыпа, загадчыка кафедры лічбавага аналізу, атрымліваюць вышэйшую адукацыю. За гэтым ідзе адбор для навучання на 4 і 5 курсах з мэтай набыцця універсітэцкай адукацыі. У маёй прысутнасці спецкурс чытаўся ўсяго толькі для пяці старшакурснікаў.

| Факультэт | Студэнтаў формы навучання | | Кафедр і лабараторый | Выкладчыкаў і даследчыкаў |
|---|---|---|---|---|
| | дзённай | вячэрняй і завочнай | | |
| 1 | 974 | 486 | 21 | 140 |
| 2 | 1922 | 1537 | 66 | 581 |
| 3 | 1785 | 353 | 57 | 528 |
| 4 | 910 | — | 11 | 98 |

На сельгасработы адпраўляюць студэнтаў 1—3 курсаў. Старшакурснікі не прыцягваюцца да іх. Размер стыпендыі цесна ўвязаны з паспяховасцю. Вучэбная дысцыпліна падтрымліваецца матэрыяльнымі фактарамі. Напрыклад, за нездадзеную ў тэрмін кантрольную работу студэнт штрафуецца ў памеры 50 форынтаў (каля 3 руб.).

У суботу і ў нядзелю асноўныя школы гімназіі і універсітэты не працуюць.

**І. БРУЙ,**
**загадчык кафедры матаналізу, дацэнт.**

*Беларуская музычная восень*

# АРТЫСТ ЭСТРАДЫ І КІНО

XIII Усесаюзны фестываль мастацтваў «Беларуская музычная восень» па-сапраўднаму захапіў тысячы гамяльчан. Яны з вялікай цікавасцю прыходзяць у гэтыя дні на канцэрты, якія ідуць на сцэнах многіх Палацаў культуры, навучальных устаноў.

Для калектыву нашага універсітэта памятнай стане сустрэча з артыстам эстрады і кіно, дыпламантам Усерасійскага конкурсу ленінградцам Аляксандрам Міхайлавым. Яму ўласціва ярка выражаная індывідуальнасць, яго рэпертуар шырокі і разнастайны, разлічаны на густы розных катэгорый слухачоў.

У праграме артыста творы Аляксандра Блока, Анны Ахматавай, Сяргея Ясеніна, Барыса Пастэрнака, Андрэя Вазнясенскага, Яўгена Еўтушэнкі, вершы і песні Роберта Бернса, Булата Акуджавы. Музычнае суправаджэнне — Наталлі Дзянісавай.

**Канцэрт Аляксандра Міхайлава адбудзецца 26 лістапада ў актавай зале ГДУ. Пачатак — у 14.00.** Білеты распаўсюджваюцца праз прафкам студэнтаў.




# ТВОРЫ ВЯЛІКАГА СЫНА РАСІІ

Споўнілася 275 гадоў з дня нараджэння грамадзяніна, вучонага, паэта М. В. Ламаносава. У бібліятэку ГДУ паступіла новая кніга «Выбраная проза», у якую ўвайшлі творы М. В. Ламаносава.

Лёсы чалавечы і народны неразрыўныя пад пяром Ламаносава, таксама як і ў яго душы. Са старонак яго твораў, ці то пісьмы, ці дзелавыя запісы, гістарычныя сачыненні, паўстае чароўны, поўны драматызму вобраз аднаго з лепшых сыноў Расіі.

Нас радуе і прыцягвае высакароднасць яго натуры, здольнасць узняцца над мітуснёй, здзіўляе працалюбства і настойлівасць, з якімі ён прыступае да сваіх шматлікіх задумак, здзяйсненняў і не адступае ад задуманага, нягледзячы ні на якія перашкоды.

Цікава сачыць за імклівым палётам яго здзіўляючага розуму, заўсёды ахопленага грандыёзнымі ідэямі, накіраванымі на карысць Айчыны. Не менш цікава назіраць за рухамі яго адкрытай, паэтычнай душы. Чытаць Ламаносава — вялікая асалода. Яго проза — гэта споведзь, праўдзівая, без утойвання. Гэта таксама гарачая, праўдзівая прапаведзь. Слова і справа Ламаносава не пакідаюць раўнадушным, узвышаюць розум, аблагароджваюць душу, даюць новыя імпульсы нашым асабістым ідэйным і маральным пошукам. Чытаючы Ламаносава, больш глыбока разумееш і іншых вялікіх рускіх людзей, адчуваеш духоўную еднасць передавых розумаў.

Кніга выбранай прозы М. В. Ламаносава — яркі, дакументальны расказ-споведзь Ламаносава аб тым, як ён аддаў усяго сябе роднаму народу.

**М. ГАПЕЕВА,**
**загадчыца аддзела бібліятэкі.**

# ДЛЯ ФІЗІЧНАГА ЎДАСКАНАЛЕННЯ

**Усё больш трывала ў жыццё студэнтаў уваходзяць фізкультура і спорт, якія з'яўляюцца важным сродкам ва ўсебаковым развіцці і выхаванні моладзі. Гэтаму пытанню надаецца вялікае значэнне і ў дакументах па перабудове вышэйшай школы. Пра некаторыя новаўвядзенні карэспандэнт нашай газеты папрасіў расказаць загадчыка кафедры фізічнага выхавання дацэнта В. А. Каляду.**

**— Якія новыя дырэктыўныя дакументы па фізічнаму выхаванню студэнтаў з'явіліся ў гэтым годзе?**

— Па-першае, мы атрымалі інструктыўнае пісьмо Мінвуза СССР «Аб увядзенні новых кантрольных практыкаванняў і нарматываў для ацэнкі фізічнай падрыхтаванасці студэнтаў ВНУ». У ім прадугледжана ўключэнне новых кантрольных практыкаванняў і нарматываў з 1 верасня бягучага года ў вучэбную праграму па фізічнаму выхаванню. Па-другое, паступіў загад Мінвуза СССР ад 16 верасня 1986 г., у якім прадугледжваецца ацэнка фізічнага стану ўсіх студэнтаў у час вучобы ў ВНУ.

**— Якія гэта практыкаванні і нарматывы фізічнай падрыхтаванасці і што ўяўляе сабой ацэнка фізічнага стану?**

— У змест кантрольных практыкаванняў і нарматываў фізічнай падрыхтаванасці ўваходзяць: у мужчын — бег на 100 м, падцягванне на перакладзіне, скачкі ў даўжыню з месца, бег на 3000 м; у жанчын — без на 100 м, падыманне тулава, скачкі ў даўжыню з месца, бег на 2000 м. Гэтыя практыкаванні выконваюцца на працягу першага месяца ў першым семестры і паўторна — у канцы кожнага навучальнага года да пачатку веснавой экзаменацыйнай сесіі.

Акрамя названых прадугледжаны і іншыя практыкаванні і нарматывы, заснаваныя на комплексе ГПА — скачкі ў даўжыню з разбегу (або ў вышыню), кіданне гранаты, бег на лыжах, плаванне, турпаход. Упершыню ўведзена дыферэнцыраваная адзнака фізічнай падрыхтаванасці па ўсіх пакасчыках, якая ўплывае на паспяховасць студэнта па фізічнаму выхаванню.

Акрамя таго, загадам Мінвуза ўведзена ацэнка фізічнага стану ўсяго кантынгенту студэнтаў, якая дазваляе выявіць узровень асобных бакоў фізічнага развіцця і падрыхтаванасці студэнтаў і актывізаваць іх імкненне да фізічнага ўдасканалення.

**— Віктар Антонавіч, раслумачце, калі ласка, з якіх паказчыкаў яна складаецца?**

— З пяці паказчыкаў. Тры з іх — бег на 100 м, скачок у даўжыню з месца і падыманне тулава (або падцягванне ў мужчын) — гэта вынікі праведзенай вышэй кантрольнай праверкі. Два астатнія паказчыкі вызначаюцца велічынямі вага-ростава паказчыка і функцыянальнай пробы, якія разлічаны на ўзроставы кантынгент 17—30 гадоў.

Вага-ростава паказчык складаецца з вагі студэнта, якая дзеліцца на рост у сантыметрах. Ацэньваецца колькасць атрыманых грамаў вагі, якая прыходзіцца на 1 см росту.

Функцыянальная проба — гэта велічыня перавышэння частаты пульса пасля 20 прысяданняў параўнальна з зыходнай (у працэнтах). Напрыклад, зыходная частата пульса 60 уд/мін., пасля прысяданняў — 72 уд/мін. Перавышэнне: — 20%. Адзнака — «выдатна».

**— Як будзе фіксіравацца адзнака фізічнага стану?**

— Упершыню ў заліковую кніжку студэнта будзе ўклеены ўкладыш, куды заносіцца адзнака фізічнага стану. Ацэнка пяцібальная: «выдатна» — 5, «добра» — 4, «здавальняюча» — 3, «дрэнна» — 2, «вельмі дрэнна» — 1.

# ПРАВЕРКА МАЙСТЭРСТВА

З горада на Няве — Ленінграда вярнуліся фехтавальшчыкі нашага універсітэта (трэнер — В. В. Лісоўскі). Яны прымалі ўдзел у традыцыйным турніры мушкецёраў-чыгуначнікаў. Сёлета ён быў юбілейным — дзесятым па ліку і як усе папярэднія выклікаў вялікую цікавасць аматараў гэтага віду спорту.

На баявыя дарожкі, акрамя гаспадароў — студэнтаў Ленінградскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту, выйшлі члены зборных каманд Маскоўскага інстытута інжынераў транспарту, Азербайджанскага і Львоўскага ДСТ «Лакаматыў», мацнейшыя фехтавальшчыкі ВНУ г. Ленінграда, гамяльчане. Сярод удзельнікаў спаборніцтваў было каля 20 майстроў спорту СССР.

Большасць баёў па ўсіх відах зброі праходзіла ў захапляючай барацьбе. Для гамяльчан гэты турнір з'явіўся добрай школай павышэння майстэрства. Сярод іх найбольш вызначыўся майстар спорту СССР студэнт эканамічнага факультэта Генадзь Пырко, які ў фехтаванні на шпагах заняў другое месца. Добра зарэкамендаваў сябе і трэцякурснік факультэта фізвыхавання Аляксандр Стасенка. Ён упэўнена наблізіўся да выканання запаветнага майстарскага нарматыву.

У камандным заліку сярод нашых фехтавальшчыкаў лепшы вынік у жанчын-рапірыстак. У турнірнай табліцы яны занялі чацвёрты радок. Слабей выступілі мужчыны: шпажысты дасталося пятае месца, шаблістам — шостае.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# МОЖНА ЗАКАЗАЦЬ ФІЛЬМЫ

**«Чароўны востраў»**, 3 ч., чорна-белы. Аб Маскоўскім тэатры жэста і мімікі.

**«Твой тэатр»**, каляровы (аб Маскоўскім маладзёжным тэатры-студыі на Краснай прэсні).

**«Кіно расказвае аб сабе»**, 7 ч., чорна-белы (аб гісторыі зараджэння, развіцці і дасягненнях савецкай кінематаграфіі).

**«Нараджэнне савецкага кіно»**, 7 ч., ч/б **«Каля вытокаў савецкага кіно»**, 7 ч., ч/б (аб першых савецкіх кінакцёрах).

**«Масфільму — 60»**, 3 ч., каляровы. Кінапанарама творчасці калектывау кінастудыі.

**«У нас на «Масфільме»**, 3 ч., каляровы.

**«Самае масавае з мастацтваў»**, 2 ч., каляровы. (З гісторыі савецкага кіно).

**«Сцэна, экран, мастак»**, 2 ч., каляровы.

За даведкамі звяртацца ў лабараторыю тэхнічных сродкаў навучання (корпус № 1, п. 4—6).

# ВАШ АДПАЧЫНАК

Сёння: Вечар адпачынку. Дыскатэка. Актавая зала. Пачатак у 19.30.

Сёння і заўтра: Вечары адпачынку ў інтэрнаце № 4. Пачатак у 20 гадзін.

Заўтра: Вечар адпачынку. Танцавальная праграма. Актавая зала. Пачатак у 18.30.

**На наступным тыдні:**

**26-га:** Культпаход у аблдрамтэатр на спектакль па п'есе А. Дударава «Вечар». Пачатак у 19.30.


Рэдактар Ул. БАЛОГА.


**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў АГЧ выказваюць глыбокае спачуванне ст. інжынеру па ахове працы ГАМАЛЕЕВУ Міхаілу Сцяпанавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**


«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

АЗ 13513

Заказ 819